

## ОТДЕЛЕНИЕ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК И ИСКУССТВ



**Александр Коваленя,**
академик-секретарь Отделения гуманитарных наук и искусств, академик

# ГУМАНІТАРНАЯ НАВУКА – БЕЛАРУСКАМУ ГРАМАДСТВУ

Інавацыйнае развіццё Беларусі можа быць пасяховым тады, калі ў грамадстве ўмацуецца не толькі ідэя неабходнасці ўдасканалення новых тэхналагічных укладаў, але і, самае галоўнае, разуменне важнасці гуманітарнага рэсурсу – адукацыйнага, ідэалагічнага і маральнага, паколькі менавіта ён вызначае прагрэс грамадскага развіцця і з'яўляецца яго ключавым фактарам і рухаючай сілай. Гуманітарная навука была заўсёды заклікана служыць кансалідацыі грамадства, шукаць навукова абгрунтаваныя шляхі пераадолення крызісу духоўнасці, умацоўваць гістарычную свядомасць людзей, гарманізаваць сацыяльна-вытворчыя адносіны. Менавіта гэтым мэтам служаць завершаная ў 2020 г. дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. і заданні новай праграмы на 2021–2025 гг.

Адгукаючыся на выклікі жыцця, у межах гэтай праграмы былі падрыхтаваны і ўхвалены шырокай грамадскасцю многія фундаментальныя акадэмічныя даследаванні, якія самым станоўчым чынам паўплывалі на міжканфесійную і міжнацыянальную кансалідацыю, на грамадска-палітычную моц беларускага грамадства. Сярод іх неабходна назваць фундаментальныя выданні: «Гарады і вёскі Беларусі», «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы», «Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне», «Страна в огне», «Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі», першы ў Еўропе «Вялікі гістарычны атлас», першы і адзіны ў свеце 37-томны «Гістарычны слоўнік

беларускай мовы», арыгінальныя шматтомныя выданні «История белорусской государственности», «Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений» і шматлікія іншыя творы.

У названых і многіх іншых працах не толькі красамоўна, дакладна і пераканаўча даказана прысутнасць беларусаў у еўрапейскай і сусветнай гісторыка-культурнай прасторы, але і паказаны іх уклад у сусветную скарбонку матэрыяльнага і культурнага развіцця грамадства.

Важна адзначыць, што выяўленне і навуковае асэнсаванне археалагічных матэрыялаў, збіранне і захоўванне народных песень, казак, прыказак, прымавак, народных промыслаў – гэта не самамэта, а сродак вырашэння найважнейшай нацыянальна-ідэнтыфікацыйнай задачы. Больш за тое, матэрыялы, выкладзеныя ў фундаментальных працах, дапамагаюць не толькі ажыццяўляць рэканструкцыю светапогляднага пачатку беларускага народа, але і вызначаць яго месца ў еўрапейскай супольнасці. Прычым багацце матэрыялаў вуснай народнай творчасці раскрывае не толькі сутнасць, але і веліч народнага духу, яго імкненне да справядлівасці, шчырага суперажывання, гатоўнасці дапамагчы іншаму чалавеку, а ў цяжкую хвіліну нават да самаахвяравання дзеля ўсеагульнага дабра. Гэта той найбагацейшы нацыянальны субстрат, які спрыяе выхаванню патрыятызму і грамадзянскіх якасцей беларускага народа, дапамагае маладому пакаленню станавіцца актыўнымі будаўнікамі сучаснага грамадства.

Сусветная і айчынная гуманітарыстыка сёння сапраўды назапасілі шмат ведаў, але недастаткова генерыруюць ідэі, якія здольныя вызначаць развіццё грамадства. Задача заключаецца ў тым, каб у час сусветнай глабалізацыі і інфарматызацыі грамадскага жыцця надаць гуманітарным навукам практычную накіраванасць, не адмяняючы, а, наадварот, узмацняючы і раскрываючы іх асаблівасці і спецыфіку. Уяўляецца, што ў XXI ст. лёс чалавецтва залежыць, у першую чаргу, ад таго, ці здолее сусветнае грамадства ўсвядоміць, што не войны і рэвалюцыі, а дыялог з'яўляецца сродкам вырашэння ўсіх рэальна існуючых праблем.

Як ужо адзначалася, значэнне гуманітарных ведаў заўсёды было істотным, паколькі ацэньваць сутнасць жыцця і дзейнасці людзей немагчыма без сацыяльна-гуманітарных навук. Прадметам іх вывучэння з'яўляюцца чалавек і грамадства ў цэлым. Менавіта сэнс такіх культурна-гістарычных каштоўнасцей, як ісціна, дабро, прыгажосць, справядлівасць, з'яўляецца прыярытэтным фактарам сацыяльнага развіцця грамадства і складае галоўны змест даследаванняў акадэмічных вучоных-гуманітарыяў.

Адзначым, што ў апошнія гады іх творчая праца дазволіла зрабіць значны крок у развіцці айчыннай гуманітарнай навукі. Філосафы і сацыёлагі, гісторыкі і археолагі, мовазнаўцы і літаратуразнаўцы, эканамісты і прававеды, культуролагі і мастацтвазнаўцы, этнографы і фалькларысты паспяхова завяршылі выкананне 39 заданняў Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».

Намаганні кіраўнікоў падпраграм і вучоных былі накіраваны на вырашэнне важнейшых для грамадства праблем:

- *распрацоўку гісторыі і тэорыі беларускай дзяржаўнасці, працэсу станаўлення беларускай нацыі, фарміравання і развіцця яе культуры, мовы і літаратуры;*
- *навуковае забеспячэнне эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, прымнажэння чалавечага (сацыяльна-дэмаграфічнага, інтэлектуальнага, духоўнага, адукацыйнага, культурнага) капіталу;*


Посещение Председателем Президиума НАН Беларуси академиком В. Гусаковым Музея древнебелорусской культуры

- *захаванне і ўмацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ў кантэксце выклікаў сучаснасці і сусветных інтэграцыйных працэсаў;*
- *падрыхтоўку механізмаў і практычных рэкамендацый, накіраваных на павышэнне ўзроўню духоўна-культурнага, сацыяльна-эканамічнага і інавацыйнага развіцця краіны.*

Дзякуючы творчым намаганням вучоных Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі былі дасягнуты бачныя вынікі: апублікавана звыш 7300 навуковых прац (без уліку тэзісаў), з іх амаль 1600 – у замежных навуковых выданнях. Падрыхтавана і выдадзена 679 кніжных выданняў, у тым ліку 274 манаграфіі, 131 даведнік і энцыклапедыя, 188 зборнікаў навуковых прац. Распрацавана 86 падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў, працоўных сшыткаў, навучальных карт. Падрыхтавана і апублікавана звыш 6500 навуковых артыкулаў



Министр образования Республики Беларусь А. Иванец и министр культуры Республики Беларусь А. Маркевич знакомятся с находками академических археологов (раскопки городища Менка)

і дакладаў, амаль 2000 тэзісаў дакладаў. У працэсе выканання дзяржаўнай праграмы даследчыкамі былі ўстаноўлены 121 заканамернасць і 56 новых залежнасцей, распрацаваны 71 новы метад і методыка, 4 макеты сістэм, комплексаў і матэрыялаў і 1 эксперыментальны ўзор.

Акрамя таго, кіраўнікі навуковых установ і даследчыкі праціягвалі актыўную працу па пошуку пазабюджэтных сродкаў, якая прынесла бачныя вынікі: за 2016–2020 гг. арганізацыі Аддзялення рэалізавалі звыш 1000 дагавораў па стварэнні навукова-тэхнічнай прадукцыі і аказанні паслуг на суму амаль 9 млн руб., выканалі звыш 60 замежных кантрактаў і грантаў на суму 425 тыс. долараў.

Значныя вынікі былі дасягнуты Інстытутам гісторыі і Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі па падпраграме «Гісторыя і культура». За пяцігодку было апублікавана звыш 3 тыс. навуковых прац, з якіх 567 – у замежных навуковых выданнях. Падрыхтавана і выдадзена 320 кніжных выданняў, у тым ліку 130 манаграфій, 64 даведнікі і энцыклапедыі, 98 зборнікаў навуковых прац. Распрацавана 28 падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў, працоўных сшыткаў, навучальных карт. Падрыхтавана і апублікавана 2875 навуковых артыкулаў і дакладаў.

Сярод найбольш значных фундаментальных гістарычных выданняў неабходна адзначыць «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», унікальны 5-томнік «История белорусской государственности», у якім упершыню ў гістарыяграфіі прааналізаваны перадумовы, устаноўлены заканамернасці, разгледжаны і ахарактарызаваны этапы, формы, напрамкі і асаблівасці працэсу станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ад вытокаў да сучаснасці.

Завершана праца па выданні ўнікальнай навуковай энцыклапедычнай шматтомнай серыі «Гарады і вёскі Беларусі», у якой упершыню ў айчыннай навуцы адлюстраваны асноўныя звесткі гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця гарадоў, пасёлкаў гарадскога тыпу, аграгарадкоў, вёсак і хутароў рэспублікі з часу іх заснавання і да нашых дзён.

Сумеснымі намаганнямі нашых вучоных у першыню ў гісторыі краіны падрыхтавана і выйшла ў свет 7-томнае навукова-папулярнае выданне «Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений», якое з'яўляецца найбуйнейшым навукова-выдавецкім праектам

у найноўшым часе. У ім прадстаўлена больш за 100 тэм, якія адлюстроўваюць дасягненні беларускага народа за 25 гадоў суверэнітэта ў працэсе дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльна-эканамічнага, духоўнага і культурнага развіцця.

Плённая навукова-даследчая праца была разгорнута вучонымі-эканамістамі па падпраграме «Эканоміка», у выкананні якой удзельнічалі Інстытут эканомікі і Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі, было апублікавана амаль 2 тыс. навуковых работ, з якіх больш за палову – у замежных навуковых выданнях. Падрыхтавана і выдадзена больш за сотню кніг, у тым ліку 56 манаграфій, 5 зборнікаў навуковых прац. Распрацавана 15 падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў. Падрыхтавана і апублікавана звыш 1000 навуковых артыкулаў і дакладаў.

Усяго за перыяд з 2016 па 2020 г. навукоўцамі Інстытута эканомікі праводзілася больш чым 90 навукова-даследчых работ, у тым ліку па 7 праектах з замежнымі партнёрамі. Тут распрацаваны: інстытуцыянальны механізм забеспячэння эканамічнага развіцця; канцэптуальная мадэль дасягнення ўстойлівага росту на аснове экалагізацыі эканомікі; метадычныя рэкамендацыі па ацэнцы ўзроўню эканамічнага патэнцыялу пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнаў Рэспублікі Беларусь; арганізацыйна-эканамічны механізм функцыянавання «разумнага горада»; Канцэпцыя ўдасканалення фінансавай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь; Канцэпцыя міжрэгіянальнай інтэграцыі і яе рэгулявання на субнацыянальным узроўні ў ЕАЭС; праект Стратэгіі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі да 2035 г. У ходзе навуковых даследаванняў упершыню распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя асновы забеспячэння інавацыйнай успрымальнасці эканомікі, эканаметрычная мадэль залежнасці паміж структурнымі зрухамі ў эканоміцы і паказчыкамі эфектыўнасці грашова-крэдытнай палітыкі.

Акрамя гэтага вучоныя-эканамісты прымалі актыўны ўдзел у экспертна-аналітычным забеспячэнні дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання краіны: кожны год выконвалася больш за 300 буйных і працаёмкіх даручэнняў, звязаных з падрыхтоўкай аналітычных матэрыялаў па пытаннях функцыянавання нацыянальнай эканомікі і выпрацоўкай прапаноў па ўдасканаленні эканамічнай палітыкі рэспублікі.



Знакомство с социологическими знаниями через игру, Фестиваль науки 2022



Директор Института истории НАН Беларуси В. Лакиза знакомит премьер-министра Республики Беларусь Р. Головченко с итогами раскопок на древних городищах



Книжная выставка Издательского дома «Беларуская навука», 2022 г.

Вялікую працу ажыццяўлялі вучоныя-сацыёлагі. У выкананні падпраграмы «Сацыялогія і філасофія» ўдзельнічалі даследчыкі Інстытута сацыялогіі і Інстытута філасофіі НАН Беларусі. За пяцігодку было апублікавана 1355 навуковых прац, з якіх звыш 400 – у замежных навуковых выданнях. Падрыхтавана і выдадзена 108 кніг, у тым ліку 18 манаграфій, 4 даведнікі і энцыклапедыі, 42 зборнікі навуковых прац. Распрацавана 11 падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў. Падрыхтавана і апублікавана 1247 навуковых артыкулаў і дакладаў.

Даследаванні айчынных вучоных-філосафаў былі накіраваны на стварэнне комплекснага тэарэтыка-метадалагічнага інструментарыю, неабходнага для мадэрнізацыі сацыякультурнай сістэмы Беларусі на этапе будаўніцтва грамадства, заснаванага на ведах, для стратэгічнага планавання і экспертызы сацыякультурнага развіцця, умацавання інтэлектуальнага і сацыяльнага капіталу Беларусі і духоўна-маральнага патэнцыялу асобы грамадзяніна на аснове сучасных здабыткаў філасофскіх, міждысцыплінарных і канвергентных ведаў.

Упершыню ў беларускай гуманітарыстыцы распрацавана канцэптуальная мадэль развіцця беларускай філасофіі ў кампаратыўнай перспектыве, што дазволіла апісаць дынаміку яе станаўлення, выявіць месца ў сусветнай інтэлектуальнай прасторы. Праведзена дасканалае вывучэнне этнафіласофіі народа як неад'емнай часткі еўрапейскай культуры. Распрацавана міждысцыплінарная метадалагічная база комплекснага даследавання і стратэгічнага прагназавання геапалітычнага і культурна-цывілізацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь у сучасных умовах глабалізацыі і рэгіяналізацыі свету.

Вучоныя Інстытута сацыялогіі у 2016–2020 гг. падрыхтавалі больш за 100 навукова-аналітычных запісак па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў нашай краіны, якія былі прадстаўлены ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама зацікаўленым органам дзяржаўнага кіравання.

Вялікая праца ажыццёўлена вучонымі-мовазнаўцамі і літаратуразнаўцамі па падпраграме «Беларуская мова і літаратура», у выкананні якой удзельнічаў Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляюцца 1256 навуковых прац, з якіх звыш 100 надрукавана ў замежных выданнях. Падрыхтавана і апублікавана 18 манаграфій, 47 слоўнікаў, даведнікаў і энцыклапедый, 36 зборнікаў навуковых прац, 10 падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў, а таксама апублікавана 1145 навуковых артыкулаў і дакладаў.

Вучоныя-мовазнаўцы на працягу 2016–2020 гг. праводзілі шырокамаштабнае даследаванне сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, тэарэтычнае асэнсаванне змен і тэндэнцый, што праявіліся ў яе сістэме ў апошнія дзесяцігоддзі як адлюстраванне складаных змен у жыцці грамадства. Працягвалася даследаванне слоўнікавага складу беларускай літаратурнай мовы канца XX – пачатку XXI стст. і праца над стварэннем з улікам сучасных лексікаграфічных тэндэнцый і тэхналогій новага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы.

Была падрыхтавана серыя тлумачальных слоўнікаў актуальнай беларускай лексікі, тэрміналагічных, разнастайных спецыяльных слоўнікаў для забеспячэння вучэбнага працэсу ў школе і ВНУ, перакладных руска-беларускіх і беларуска-рускіх слоўнікаў для ўнутраных патрэб моўнай практыкі, а таксама падручных беларуска-іншамоўных і іншамоўна-беларускіх слоўнікаў, што звязана з выхадам Беларусі як самастойнага суб'екта палітычнай, эканамічнай і культурнай дзейнасці на міжнародную арэну.

Завершана выданне «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» ў 37 выпусках – першага і адзінага ў айчыннай і замежнай гуманітарнай навуцы даведніка, які з максімальнай паўнатой адлюстроўвае склад і стан лексічнай сістэмы беларускай мовы XIV–XVIII стст., дае змястоўную інфармацыю аб сацыяльна-эканамічным жыцці, матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа ў названы перыяд. Слоўнік не мае аналагаў у еўрапейскім і сусветным мовазнаўстве. Паспяховае і выніковае заканчэнне гэтай шматгадовай работы ўмацоўвае не толькі статус беларускага мовазнаўства і беларускай гуманітарнай навукі на міжнародным узроўні, але і нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Упершыню ў айчынным мовазнаўстве створаны Нацыянальны корпус беларускай мовы, які ўтрымлівае ўсе тыпы пісьмовых і вусных тэкстаў, прадстаўленыя ў адпаведныя перыяды. У выніку выканання праекта распрацаваны электронны корпус тэкстаў аб'ёмам 80 млн словаўжыванняў са структур-

най і граматычнай разметкай і пашпартызацыяй і яго эксперыментальны рухавік.

Нельга не адзначыць «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы» – першы поўны акадэмічны слоўнік беларускай мовы, у якім праз падачу поўнай транскрыпцыі слоў прапануецца апісанне літаратурнага вымаўлення больш за 117 тыс. слоў, што бытуюць у сучаснай мове.

Вучоныя-літаратуразнаўцы ажыццявілі навукова-тэксталагічнае даследаванне творчасці класіка беларускай літаратуры Янкі Брыля. На высокім навуковым узроўні з улікам дасягненняў сучаснага літаратуразнаўства, тэарэтычнай думкі і эдыцыйнай практыкі апошніх гадоў выканана тэксталагічная падрыхтоўка да выдання першага навукова каментаванага збору твораў пісьменніка ў 10 тамах.

Трэба адзначыць, што правядзенне якасных навуковых даследаванняў вучоных-гуманітарыяў было б немагчымым без Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа, Выдавецкага дома «Беларуская навука», якія аказваюць значную інфармацыйную падтрымку ў правядзенні навуковых даследаванняў, а таксама папулярызуюць навукова-тэхнічныя веды.

Акадэмічныя вучоныя-гуманітарыі распачалі працу па выкананні заданняў дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. За гэты кароткі час зроблена нямала.

Так, падчас даследавання старажытнага Менска на рацэ Менка ў в. Гарадзішча Мінскага раёна ўпершыню былі выяўлены аб’екты IX–X стст., якія адносяцца да самага ранняга этапу засялення гэтай тэрыторыі славянскімі плямёнамі. Створаны комплекс картаграфічных матэрыялаў (карт, картасхем) па палітычнай гісторыі беларускіх земель ад старажытных часоў да пачатку XXI ст.

Вучоныя Інстытута сацыялогіі ў працэсе пошукаў напрамкаў сучаснага грамадскага развіцця стварылі канцэптуальную схему даследавання феномена лічбавізацыі грамадства, распрацавалі сацыялагічную мадэль эканамічных паводзінаў сацыяльных суб’ектаў у новых умовах. За паўтара года было праведзена амаль 50 рэспубліканскіх і рэгіянальных сацыялагічных даследаванняў. Па іх выніках у Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў, органы дзяржаўнага кіравання накіравана звыш 70 аналітычных запісак.

Мінулы год стаў значным этапам у развіцці беларускай філасофскай школы. Вучоныя Інстытута філасофіі ўпершыню зрабілі сістэмную рэканструкцыю ключавых тэм, ідэй і паняццяў традыцыйнага светапогляду беларусаў. Створана канцэпцыя, якая апісвае ўзнікненне і развіццё філасофскіх ідэй і ўяўленняў у традыцыйнай беларускай культуры. Распрацоўка ўвайшла ў топ-10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі за 2021 г. у галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Вынікі працы прадстаўлены ў навукова-папулярным выданні «Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія», якое карыстаецца папулярнасцю ў шырокага чытача.

Навуковыя даследаванні, якія праводзяцца вучонымі Інстытута эканомікі НАН Беларусі, з’яўляюцца асновай для распрацоўкі стратэгіі і механізмаў забеспячэння збалансаванасці эканамічнага росту, садзейнічаюць практычнаму фарміраванню стратэгіі развіцця нацыянальнай інавацыйнай сістэмы, а таксама сферы паслуг.

Айчынныя эканамісты ў выніку выканання фундаментальных даследаванняў у 2021 г. упершыню распрацавалі методыку ацэнкі ўкладу прамысловасці ў дасягненне мэт і выкананне задач устойлівага развіцця, якая ўключае 44 паказчыкі ў разрэзе 11 мэт і 24 задач.

Сярод вынікаў плённай працы вучоных Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі неабходна адзначыць вялікую працу мовазнаўцаў, якія мэтанакіравана вывучалі сістэму сучаснай беларускай літаратурнай мовы і яе месца ў камунікатыўнай прасторы. У 2022 г. падрыхтаваны і выдадзены новы «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (у 2 тамах), які ўтрымлівае звыш 65 тыс. слоў.

Вучоныя-літаратуразнаўцы распрацавалі канцэпцыю першага навукова каментаванага «Збору твораў Кузьмы Чорнага» (у 12 тамах), а таксама падрыхтавалі і выдалі 21-ы і 22-і тамы серыі «Залатая калекцыя беларускай літаратуры».

У цэлым вынікі творчай дзейнасці вучоных-гуманітарыяў спрыяюць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю нашай краіны, умацоўваюць палітычную сістэму і дзяржаўнасць, садзейнічаюць выхаванню патрыятызму ў падрастаючага пакалення, умацоўваюць пазіцыі нашай дзяржавы на міжнароднай арэне і пацвярджаюць высокі статус беларускай гуманітарнай навукі ў свеце.

фото Сергея ДУБОВИКА